УДК 811.161.3’38

# СТЫЛІСТЫЧНАЯ РОЛЯ АКАЗІЯНАЛІЗМАЎ

***А. У. Канапелька*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***В. М. Шаршнёва***,
канд. філал. навук, дацэнт

Паэты і пісьменнікі ў пошуках выразных сродкаў мастацкага маўлення часам звяртаюцца да словатворчасці. Мастацкі падыход да асэнсавання рэчаіснасці стварае неабмежаваныя магчымасці для наватарства. Аўтарскай задуме падпарадкоўваюцца не толькі нарматыўныя факты мовы, але і адхіленні ад літаратурных норм. Спецыяльна, знарок, у «рабочым» парадку як своасаблівы эксперымент ствараюцца, зусім не прэтэндуючы на агульнае ўжыванне, аказіяналізмы, або індывідуальна-аўтарскія словы. Такія лексічныя адзінкі часцей за ўсё не замацоўваюцца ў кадыфікаванай мове, а з’яўляюцца фактамі маўлення толькі пэўнай асобы або замацоўваюцца толькі ў пэўным кантэксце, г. зн. належаць мове толькі асобнага аўтара. Гэтыя словы заўсёды прывязаны да пэўнага кантэксту і лёгка тлумачацца на яго фоне. Яны вылучаюцца сваёй эмацыянальна-экспрэсіўнай афарбоўкай.

Стварэнне індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў звычайна звязана з выкарыстаннем словаўтваральных рэсурсаў роднай мовы. Эстэтычная каштоўнасць такіх наватвораў вызначаецца мастацтвам аўтара, яго ўменнем прымяніць найбольш яркія і стылістычна апраўданыя экспрэсіўныя фарбы тых ці іншых словаўтваральных мадэляў. Многія аказіяналізмы ствараюцца на аснове вобразнага асэнсавання іх словообразующей мадэлі. У іх могуць быць «схаваны» эпітэты, метафары, параўнанні. Так, напрыклад, для аказіяналізмаў А. Вялюгіна ўласціва скрытае параўнанне: *Салаўяцца яры, / Атаманяць вятры / Пад гарою / Ля сцен Магілёва*. Стварэнне некаторых аказіяналізмаў абумоўлена гумарыстычнай устаноўкай аўтара, як гэта мае месца ў наступным выпадку: *З трэцяга ў чацвёрты клас / Не пяройдзе тачыляс, / Бо не вучыцца ўвесь час – / Точыць лясы тачыляс* (В. Вітка).

Як відаць, для стылістычнага выкарыстання індывідуальна-аўтарскіх наватвораў вялікае значэнне мае функцыянальна-стылявая афарбоўка словаўтваральных мадэляў, паводле якіх ствараюцца новыя словы. Несумненна, індывідуальна-стылістычныя наватворы значна ўзбагачаюць выяўленчую аснову твора, дазваляюць максімальна дакладна перадаць аўтарскае светаадчуванне. Выконваючы функцыю сэнсавых і эмацыянальных узмацняльнікаў, такія словы вызначаюцца не толькі нечаканасцю і незвычайнасцю менавіта ў сваёй структуры і семантыкі.

Утвараючыся насуперак агульнапрынятых правіл словаўтварэння і адрозніваючыся ад унармаваных слоў, яны валодаюць уласцівасцю неўзнаўляльнасці, ненарматыўнасці і функцыянальнай аднаразовасці. Як правіла, такія лексічныя адзінкі не адпавядаюць агульнапрынятым моўным нормам, характарызуюцца індывідуальным густам творцы і абумоўлены спецыфічным кантэкстам ужывання.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова